# САЛДАТ МІРУ

**(Да 20-годдзя з дня смерці А. Барбюса)**

30 жніўня споўнілася дваццаць год з дня смерці выдатнага французскага пісьменніка-інтэрнацыяналіста, вяшчальніка адзінага фронта працоўных супраць вайны і фашызма — Анры Барбюса.

Сорак год назад А. Барбюс, грэбаючы усемагчымымі ільготамі, апрануў салдацкі шынель і раздзяліў з мільёнамі простых людзей Францыі цяжкасці і жахі акопнай вайны. Пісьменнік беспамылкова выбраў шлях зліяння з масай, і іменна таму з поўным правам назваўся салдатам чалавецтва. Стаўшы салдатам 235-га лінейнага палка, А. Барбюс дзень за днём усё больш разумее прычыны і мэты першай сусветнай вайны, справакаванай сквапнымі магільшчыкамі народаў. У дзённіках і пісьмах з фронта да жонкі накапляліся факты і ўражанні, што ляглі ў аснову рамана «Агонь». «У час прабывання ў шпіталі — успамінаў Барбюс — я напісаў кнігу «Агонь», якая з'яўляецца расказам аб прабуджэнні пралетарскага сумлення на палях бітвы». Сваю кнігу «Агонь» А. Барбюс назваў дзённікам аднаго ўзвода.

Раманы А. Барбюса «Агонь» і «Яснасць», далёкія ад сляпой разгубленасці перад крывавымі жахамі вайны, з'явіліся па словах В. І. Леніна «адным з асабліва наглядных пацверджэнняў паўсюдна заўважаемай з'явы росту рэвалюцыйнай свядомасці ў масах».

«Слова барацьбіта», «Мы абвінавачваем», «Свет з бездані»—такія назвы артыкулаў, якія вызначаюць дух барбюсаўскай публіцыстыкі тых гадоў, калі пісьменнік выкрываў усе сафізмы, якімі прыкрываліся зладзейскія планы новых падпальшчыкаў вайны — інтэрвентаў. Барбюс не толькі ярка асвятліў злачынствы імперыялістычнай вайны і антысавецкай інтэрвенцыі, але і адным з першых указаў інтэлігенцыі Еўропы шлях да сумленнай гераічнай барацьбы сярод пралетарыята. Гэтая яго дзейнасць сустракала сяброўскую падтрымку ў В. І. Леніна і А. М. Горкага. Як арганізатар групы антываеннай інтэлігенцыі «Клартэ», пазней — як публіцыст «Юманітэ», А. Барбюс упісаў новую старонку ў гісторыю рэвалюцыйнай публіцыстыкі і рэпартажа. Ён узнімаў свой голас у абарону народаў, дзе-б ні бачыў іх прыгнечанымі: у Афрыцы і Індыі, у Югаславіі і Румыніі. Разам з А. М. Горкім Барбюс узняў голас пратэсту супраць ката кітайскага народа Чан Кай-шы і ваенна-фашысцкага заняволення Германіі.

Баявая публіцыстыка А. Барбюса вельмі часта паяўлялася на старонках нашых саюзных і рэспубліканскіх выданняў. Дзесяткі яго твораў з пачатку 30-х гадоў друкаваліся на старонках «Советской Белоруссии» і «Звязды», іх літаратурных прылажэнняў. Вядома, што кніга А. Барбюса «Расія» і артыкул «Аб рэвалюцыйнай мастацкай культуры» выданы толькі на беларускай мове.

Ва ўсёй сваёй мастацка-публіцыстычнай дзейнасці 30-х гадоў А. Барбюс даў прыклад творчага развіцця лепшых традыцый французскай мастацкай літаратуры. Імкнучыся да адлюстравання сучаснасці ў яе рэвалюцыйным развіцці і выражаючы ідэі сацыялістычнага пераўтварэння свету, А. Барбюс зрабіўся адным з заснавальнікаў сацыялістычнага рэалізма ў Францыі.

А. Барбюс з'явіўся адным з ініцыятараў парыжскага кангрэса ў абарону культуры, на якім інтарэсы народаў былі прадстаўлены такімі прызнанымі майстрамі нацыянальных культур, як Р. Ролан, і М. А. Нексе, Генрых Манн і Луі Арагон, Алексей Талстой і Якуб Колас.

А. Барбюс быў шчырым і нязменным другам савецкага народа. Яго востры і пранікнёны рэпартаж аб савецкіх рэспубліках і новабудоўлях, аб простых героях працы і новай народнай інтэлігенцыі краіны Саветаў дапамагалі рассейваць заслону хлусні і дэзінфармацыі буржуазнай прэсы. Асноўным сваім прызваннем А. Барбюс лічыў задачу садзейнічаць усямернаму збліжэнню культурных інтарэсаў і запатрабаванняў усіх народаў. Іменна гэтым духам была пранікнута яго найшырокая антыфашысцкая дзейнасць, якая паставіла яго на чале многіх і многіх сумленных інтэлігентаў свету, зрабіла яго па думках Горкага адным з пачынальнікаў антыфашысцкага руху.




Вельмі паказальны апошнія па часу працы і замыслы Анры Барбюса, якімі ён быў заняты летам 1935 года. Выдатны французскі пісьменнік каменціруе пераклад і выданне перапіскі В. І. Леніна з роднымі, ён працуе над папаўненнем кнігі аб Сталіне, знаёміць замежнага чытача з вобразамі людзей, якія з'яўляюцца «вялікім прыкладам сацыялістычнага чалавека заўтрашняга дня».

Бясстрашная барацьба супраць вайны, якая адпавядае спадзяванням мільёнаў, дазволіла А. Барбюсу заваяваць давер'е і любоў простых людзей ва ўсім свеце.

**Д. Е. ФАКТАРОВІЧ,**
**дацэнт.**

НА ЗДЫМКУ: кніга А. Барбюса «Расія», упершыню выдадзеная ў Мінску ў 1931 годзе. На кнізе узноўлен аўтограф пісьменніка: «Я дасылаю мае прывітанне і самыя шчырыя брацкія пажаданні ўсяму слаўнаму рускаму пралетарыяту».

# Газета нашых сяброў

Студэнты Варшаўскага універсітэта прыслалі нам некалькі нумароў сваёй газеты «Гарызонты». «Гарызонты» цікава і ўсебакова паказваюць студэнцкае жыццё.

Газета «Гарызонты» дзейсна дапамагае арганізацыі Саюза Польскай Моладзі ў барацьбе за трывалыя веды і добрую дысцыпліну студэнтаў. Пытанні вучобы не сходзяць са старонак газеты. Тут і замалёўкі аб лепшых студэнтах, тут і цікавы фотарэпартаж аб экзаменацыйнай сесіі, тут і артыкул аб падрыхтоўцы будучых журналістаў.

Шэраг карэспандэнцый закранае праблемы актуальнасці на семінарах, схематызма ў іх правядзенні, неабходнасці новых курсаў, напісання дыпломных работ.

У кожным нумары некалькі старонак займае аддзел «Дыскусіруем». У ім студэнты выступаюць па розных пытаннях: аб дружбе і каханні, аб шчырасці, аб недахопах у рабоце грамадскіх арганізацый, аб сваёй будучай прафесіі. Рэдакцыя рэгулярна падводзіць вынікі дыскусіі па таму ці іншаму пытанню.

Тое, што «Гарызонты» рэдагуюцца будучымі журналістамі і прадназначаюцца выключна для іх, накладвае на газету свой адбітак. Тут змяшчаюцца і першыя пробы пяра, і работы, адзначаныя на практычных занятках, і вузка спецыяльныя артыкулы аб газетных жанрах. Газета з'яўляецца сапраўднай практычнай школай будучых журналістаў. Тут рэпартаж «Авэ, Марыя», інтэрв'ю з вядомай французскай пісьменніцай Дамінікай Дэзанці і лаўрэатам V Міжнароднага конкурса імя Фрыдэрыка Шапэна, Фу Чунгам, рэцэнзіі на кінофільм «Пакаленне» і «Гадзіны надзеі», на новыя пастаноўкі тэатраў і эстрадныя праграмы, напісаныя студэнтамі II і III курсаў. Аб шырыні тэматыкі «Гарызонтаў» гавораць самі загалоўкі артыкулаў: «Мае ўражанні аб прабыванні ў ГДР» (спецыяльнага карэспандэнта газеты), «Як жыве і за што змагаецца моладзь Індыі», «Поль Робсан — спартсмен», «Выяўленчае мастацтва старажытнай Грэцыі», «Амерыканскі кампазітар Джордж Гершвін».

У кожным нумары газеты ёсць спецыяльны аддзел «Скульптура—выяўленчае мастацтва—музыка» з допісамі на рознастайныя тэмы. Тут-жа змяшчаецца «Малая энцыклапедыя», дзе даюцца тлумачэнні да рэпрадукцыі твораў вядомых мастакоў.

Газета вельмі добра, у некалькіх колерах, афармлена паліграфічна, у ёй многа добрых фота і клішыраваных загалоўкаў. Рэдакцыя часта аб'яўляе рознастайныя конкурсы, многа месца ўдзяляе спорту.

Але найбольшай папулярнасцю карыстаецца пастаянны аддзел «Гарызонтаў» «Гумар і сатыра». У ім многа выдумкі, непаддзельнага смеху. Вось дасціпныя фатаграфіі з вечара адпачыку, вось востры фельетон, вось «Новы сонік» студэнтаў—журналістаў, а такім тлумачэннем сноў: «Закахацца ў сяброўку па курсу—засыплешся на экзаменах», «Плакаць ля ўласнай труны—мастацкая самадзейнасць рыхтуе новую праграму», «З аслом гаварыць—маеш звычку гаварыць з самім сабою», «За брытву хапацца—жэнішся на аднакурсніцы», «Хлусню на хаду выдумваць—вызавуць у дэканат» і г. д.

«Гарызонты»—маладая газета, вышла яшчэ толькі 8 яе нумароў. Іле і іх дастаткова, каб пераканацца, што орган студэнтаў факультэта журналістыкі Варшаўскага універсітэта сапраўды цікавы і карысны.

**А. МАЛЬДЗІС.**

# У ВОЛЬНЫ ЧАС

## *Як, што і чаму?*

### ПАДУМАЙ І АДКАЖЫ

*У пахмурнае надвор'е гукі распаўсюджваюцца ў паветры значна лепш, чым у сухое, добрае. Чым гэта можна растлумачыць?*

### ЗДАГАДАЙСЯ

*Сцісніце руку ў кулак і пакладзіце на яе зверху карабок запалак, манету і т. п. А цяпер паспрабуйце перакласці прадмет, што знаходзіцца на руцэ, у другую руку, не дакранаючыся гэтай рукой да яго. Падкідаць прадмет уверх або паварачваць руку, на якой ён ляжыць, нельга.*

### МАЛАКО І КВАС

*Перад вамі шклянка з малаком і шклянка з роўнай колькасцю квасу. Вы бярэце лыжку квасу і ўліваеце яе ў малако, а лыжку атрыманай сумясі пераліваеце назад — у шклянку з квасам. Дзе акажацца больш пабочнай вадкасці — у малацэ кваса або ў квасе малака?*

### Ці ведаеце вы?

*Чым адрозніваюцца па прынцыпу сваёй работы такія судны, як ледакол і лёдарэз?*

### ФОРМА ЛАВАК

*Калі вы уважліва паглядзіце на сядзенні і спінкі лавак, якія стаяць у парках, садах, бульварах, скверах і г. д, то ўбачыце, што гэтым часткам лавак надаюць асаблівую выгнутую форму. Для чаго гэта робяць?*

### У глыбіні акіяна

*У глыбінях акіяна вада мае тэмпературу ніжэй нуля градусаў. Чаму-ж гэтая вада там не замярзае, звычайна-ж пры тэмпературы ніжэй нуля градусаў вада пераўтвараецца ў лёд?*

### ЗАДАЧА-ЖАРТ

*Ці можна пабудаваць такі дом, каб усе яго бакі былі звернуты на поўдзень?*

### Лятаючая манетка

*Пакладзіце на гладкі стол, або на стол, пакрыты цыратай, дзесяцікапеечную манетку. Ці можна узяць манету са стала, не дакранаючыся да яе, а таксама не паднімаючы цыраты і не нахіляючы стала? Здаецца, што зрабіць гэтага нельга. Аднак, пры невялікім навыку ўзяць манетку са стала, не дакранаючыся да яе, зусім не цяжка. Трэба паставіць руку ззаду манеткі. Затым нахіліць галаву, моцна дунуць на стол у трох-чатырох сантыметрах спераду манеткі, і яна сама ўляціць вам у руку. Як вы думаеце, якая сіла падкідае манетку са стала уверх?*

### І Ў ГАРАЧЫНЮ, І Ў ХОЛАД

*Зімой, каб абараніцца ад холаду на вуліцы, людзі апранаюць ватныя або мехавыя паліто, мехавыя шапкі і г. д. Чым-жа ў такім выпадку можна растлумачыць тое, што ў поўднёвых раёнах Сярэдняй Азіі ў самую гарачыню носяць ватнія халаты і мехавыя шапкі? Здаецца-ж, што ў такой вопратцы спёку пераносіць значна цяжэй?*

### *Лісты белых гарлачыкаў*

*Калі вам давядзецца пабываць на сажалцы, возеры або рацэ, дзе растуць белыя гарлачыкі, звярніце ўвагу на тое, як гладка распраўлены іх лісты, што ляжаць на вадзе. Прыпадыміце гэтыя лісты над вадой або, наадварот, апусціце іх у ваду; пры гэтым яны страцяць сваю тыповую распраўленую форму і рознастайна выгнуцца. Чым вы растлумачыце гэта?*

### Дакладная рэгуліроўка

*— Спяшаецца мой гадзіннік, — паскардзілася Ване Тачмехаву яго цётка. — А набок яго пакладзеш — адставаць пачынае.*

*— Адрэгулюем! — супакоіў цётку Тачмехаў і, закасаўшы рукавы, смела ўзяўся за тонкую работу.*

*Парадкам папоркаўшыся ў механізме гадзінніка, Тачмехаў з сваёй работай справіўся. З гэтага дня гадзіннік 2 разы ў суткі стаў зусім дакладна паказваць час, нягледзячы на тое, што яго механізм быў вельмі зношаны.*

*Як-жа Тачмехаў ухітрыўся правесці такую дакладную рэгуліроўку?*

### Перад паездкай

*Летам у гарачае надвор'е перад тым як сесці на веласіпед, адпраўляючыся ў далёкую прагулку, трэба праверыць, ці не вельмі моцна накачаны яго шыны, і, калі яны накачаны вельмі моцна, трэба крыху паслабіць іх. Чаму?*

### Чайнік, збан і вядро

*Многія чытачы, бясспрэчна, ведаюць, што расшырэнне да нізу ў чайніка зроблена для павялічэння паверхні нагрэву. Але чаму такое-ж расшырэнне зроблена і ў шкляным збане? Яго-ж падаграваць не трэба.*

*А вось вядро, наадварот, мае расшырэнне ўверсе.*

*Маглі-б вы гэта усё растлумачыць?*

### У гарачы дзень

*Калі ў гарачы дзень мы глядзім на млын, што віднеецца ўдалечыні, мачту высакавольтнай перадачы, дом, дрэва і г. д., то абрысы іх здаюцца нам неяснымі, расплывістымі.*

*Як вы думаеце, адчаго гэта адбываецца?*

Рэдактар В. Л. ШАЦІЛА

АТ 05731 Друкарня імя Сталіна. Заказ № 952 Тыраж 2000 эк.